агульнага. З’явіліся новыя прадукты, змяніліся ўмовы жыцця. Але кулінарныя прыхільнасці беларусаў захоўваюць нацыянальную самабытнасць. Гаспадыні яшчэ памятаюць бабуліны рэцэпты разнастайных полівак, запяканак, бліноў, аладак, мясных страў. Тым самым падцвярджаецца наша гіпотэза, што старажытныя беларускія стравы шырока вядомы і ўжываюцца ў сучасным грамадстве.

## ЛІТАРАТУРА

1. Колас, Я. Новая зямля – Мінск, 2015. – 351 с.
2. Колас, Я. Мой родны кут… – Мінск: Мастацкая літаратура, 2000.
3. Цітоў В. Этнаграфічная спадчына. – Мінск: Беларусь, 1997.

УДК 81’373.233

Вуч. Д.А. Сапожнікава
Навук. кіраўнік А.У. Корзун, настаўнік беларускай мовы і літаратуры
(ДУА “Сярэдняя школа №10 г. Пінска”)

## НІКНЭЙМЫ ЯК НОВЫ ВІД АНТРАПОНІМАЎ

Ніхто не стане аспрэчваць відавочнае: XXI стагоддзе – час хуткаснага абмену інфармацыяй, час новых тэхналогій, паслуг, час імклівага пранікнення і ўключэння адкрыццяў у рэальнае жыццё. Пашырэнне сферы медыязносін цягне за сабой змяненне мовы, перш за ўсё гутарковай, за якім не паспявае мова пісьмовая, замацаваная ў слоўніках. А ў гэты час інтэрнэтпрастора напоўнена новымі спосабамі наймення тых, хто ўступае ў моўныя ці гульнёвыя зносіны. А яны вельмі адрозніваюцца ад занатаваных у слоўніках уласных імён. Таму мы вырашылі даследаваць лінгвістычныя асаблівасці віртуальных імён, так званых найкаў, нікнэймаў, так яны мала вывучаныя, а насамрэч, яны з’яўляюцца важным складнікам менавіта моладзевага асяроддзя.

Мэта даследавання: выяўленне спецыфікі новага віду атрапонімаў – нікнэймаў.

Гіпотэза: нікнэймы як новы від імені могуць разглядацца пры вывучэнні тэмы “Уласныя назоўнікі”.

Прадмет даследавання: антрапаніміка і яе дзве разнавіднасці: псеўданімы і нікнэймы.

Аб’ект даследавання: нікнэймы вучняў VII класаў дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа №10 г. Пінска”.

Актуальнасць дадзенага даследавання ў тым, што нікнэймы, якія так шырока выкарыстоўваюцца, так мала вывучаныя. Навізна яшчэ і ў тым, што намі прапанавана свая класіфікацыя нікнэймаў, якія не маглі быць аднесены да прапанаванай класіфікацыі псеўданімаў. Практычная значнасць нашай работы ў тым, што найкі маюць права быць вывучаемымі ў кантэксце тэмы "Уласныя назоўнікі", веданне нікнэймаў класнымі кіраўнікамі і бацькамі можа дапамагчы ў выстройванні, наладжванні міжсеткавых зносін з выхаванцамі і дзецьмі, а псіхолагам некаторыя дзіцячыя найкі могуць стаць пачаткам дапамогі падлеткам.

Трэба адзначыць, што псеўданімы ў беларускім мовазнаўстве і літаратуразнаўстве вывучаны і даследаваны значна раней і глыбей, чым асабовыя імёны, прозвішчы, нават выдадзены ў 1983 годзе слоўнік беларускіх псеўданімаў, аўтар Іван Саламевіч.

Што да псеўданімаў, то гэта – гэта творчасць таленавітага, адоранага чалавека, іх можа быць неабмежаваная колькасць, і роля псеўданіма, хутчэй за ўсё, не ў модзе, не ў жаданні выдзеліцца, а наадварот, схаваць яго носьбіта. Нікнэйм – гэта асаблівая антрапанімічная адзінка неафіцыйнай штучнай намінацыі, якая выкарыстоўваецца пераважна ў інтэрнэт-камунікацыі з мэтай самаідэнтыфікацыі і саманамінацыі віртуальнай асобы. 114 нікнэймаў нашых сямікласнікаў уяўляюць сабой вельмі неаднастайную, неаднародную масу антрапонімаў новага тыпу. Мы паспрабавалі скарыстаць класіфікацыю псеўданімаў у дачыненні да нікнэймаў. І вось што атрымалася. Тры віды падышлі да класіфікацыі нікнэймаў, а астатнія класіфікавалі самі ў залежнасці ад семантыкі нікаў.

Па-першае, да фіктонімаў можна аднесці каля 41нікнэйма , што складае 35,96 % ад усіх даследаваных.

Па-другое, да абагульняльных каля 26 нікнэймаў, што складае 22,8 %. Спроба вычленіць крыптанімы сярод нікнэймаў паказала наступнае: іх не больш за 3.

Псеўдаандронімаў і псеўдагінімаў сярод сабраных намі нікнэймаў мы не знайшлі. А вось значная колькасць віртуальных імён не адпавядае прынятай да псеўданімаў класіфікацыі. Выдзелілі нікнэймы, якія ўмоўна назавём мульціандронімы, назвы якіх утвораны ад імён герояў мультфільмаў, гульняў ці фільмаў. Неабходна выдзеліць асобна і лічбава-літарныя нікнэймы, а таксама найкі, семантыку якіх нам цяжка было вызначыць, у асобную групу. Іх мы аднеслі да змешаных нікнэймаў.

Намі створаны даведнік нікнэймаў вучняў VII класаў дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа №10 г. Пінска”. Мы таксама паспрабавалі зрабіць творчы пераклад англа-рускіх нікаў, якія карыстальнікамі інтэрнэту прызнаны лепшымі. Пры перакладзе кіраваліся не даслоўным, а лінгвакультуралагічным перакладам.

Мы лічым, што нікнэймы як віртуальныя імёны, як від антрапонімаў маюць права разглядацца ў школьным курсе беларускай, рускай ды іншых замежных моў пры вывучэнні тэмы “Уласныя назоўнікі”. А калі моўная з’ява ёсць, то аб ёй, як мінімум, павінны расказваць настаўнікі. Так што мы падцвердзілі сваю гіпотэзу: нікнэймы могуць і павінны разглядацца як варыянт імені пры вывучэнні тэмы “Уласныя назоўнікі”.

УДК 811.161.3:2-183.5

Вуч. В. С. Сіднева
Навук. кір. В.С. Зязюлькіна, настаўнік беларускай мовы і літаратуры
(ДУА “Сярэдняя школа № 4 г. Віцебска”)

## КАНЦЭПТ “ДУША” Ў МОВЕ І КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСКАГА НАРОДА

У апошнія дзесяцігоддзі адной з найбольш важных праблем кагнітыўнай лінгвістыкі стала праблема выяўлення ў свядомасці чалавека цэласнай карціны свету, што фіксуецца мовай. Карціна свету цесна звязана з канцэптуальнай сістэмай і адбіваецца ў мове. Аналізуючы моўныя сродкі, мы бачым адрозненне нацыянальных культур, якія з’яўляюцца складнікамі сусветнай культуры, узаемадапаўняючы адна адну і ствараючы моўную карціну свету. Такім чынам, тэма даследчай работы бачыцца нам актуальнай, зыходзячы з праблем, пытанняў і задач, што існуюць у сучаснай кагнітыўнай лінгвістыцы. Прапануем вам напрацоўкі па вывучэнні ўжывання канцэпту “душа” ў культуры беларускага народа і паўсядзённым маўленні.

<u>Аб’ект</u> даследавання – канцэпт “душа” ў фразеалагічных адзінках беларускай мовы і моўнай свядомасці сучасных школьнікаў.

<u>Прадмет</u> даследавання – асаблівасці семантычнага напаўнення канцэпту “душа”.

<u>Мэта</u> даследавання – выявіць спецыфічныя адметнасці фразеалагічных адзінак, а таксама складнікаў асацыятыўнага поля канцэпту “душа” ў моўнай свядомасці сучасных школьнікаў.